Любоў БАРАНОЎСКАЯ / Магілёў

# Мастацкі анімалізм у прозе Кузьмы Чорнага

## Вобраз каня

Даследаванне мастацкай анімалістыкі ў беларускай прозе з'яўляецца адным з самых цікавых аспектаў сучаснага літаратуразнаўства. Вядомы рускі даследчык М. Эпштэйн адзначае, што «анімалістычныя вобразы — гэта свайго роду люстэрка... гуманістычнай свядомасці», таму «самавызначэнне ўсяго чалавечага роду не можа здзяйсняцца па-за яго адносінамі да жывёльнага свету»[1]. Мастацкае адлюстраванне жывёл знаходзіць прыкметнае месца ў творчасці Кузьмы Чорнага.

Спакон вякоў беларус-земляроб не ўяўляў сябе адарваным ад зямлі, а разам з тым ад працы на ёй. І незаменным памочнікам тут выступаў конь, якога шанавалі і берaглі. Гэтыя два вобразы зямлі і каня ў непадзельнасці паўстаюць у аповесці «Адшчапенец» Якуба Коласа, раманах «Бацькаўшчына» Кузьмы Чорнага, «Вязьмо» Міхася Зарэцкага і іншых творах беларускіх пісьменнікаў.

Малюючы вобраз каня, як і ўвогуле прыроду, Кузьма Чорны асацыіраваў яго з пэўным настроем, звязваў з характарыстыкай вобраза яго гаспадара. Ад гаспадара, яго матэрыяльнага становішча залежала тое, які конь у яго быў. Селяніну Леапольду дастаўся худы, знясілены конь, які «*адбрыкаў сваю маладосць і адрабіў сваю сілу ў Сурвілы, а да Гушкі прыйшоў дажыць сваю апошнюю старасць*»[2].

Галоўны герой рамана «Бацькаўшчына» Леапольд Гушка на сваім шляху мала бачыў добрага. На першых старонках свайго рамана аўтар знаёміць нас з цярплівым, цягавітым у працы чалавекам, які аддае ўсе свае сілы апрацоўцы камяністай дзялянкі зямлі. Тут жа некалькімі штрыхамі вымалёўваецца яго партрэт: відаць, што гэта высокі, моцны ў плячах чалавек, з цяжкім зямлістым голасам. Пісьменнік не канцэнтруе ўвагі на фізічным стане героя, яго знясіленым знешнім выглядзе. Але мастак апісвае жывёлу, з якой той адчуваў сябе запрэжаным у адно ярмо: «*Зараз пастронкі напяліся, як струны, раскудзеленыя вузлы на іх шморгаліся па конскіх баках (кожны дзень па разы тры пастронкі рваліся), конскія рэбры пачалі хадзіць пад скураю, пара павярнула з шыі гэтага божага стварэння, і яшчэ больш у яго вытыркі лапаткі, косці*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*на крыжы і вострая спіна. Мухі раіліся каля яго гнойных вачэй — конь, небарак, быў сляпы».*

Тут няма разгорнутага партрэта селяніна, але можна ўявіць, што ён адэкватны падрабязнаму апісанню каня, схуднелага, знясіленага ад цяжкай працы. Праводзячы гэту паралель, Кузьма Чорны выкарыстоўвае трапныя параўнанні: «*Гаспадар усё цягавіта і цярпліва, як вол у ярме, пагукваў на свайго каня, конь пяўся, выцягаўся, як мокрая п'яўка*» (2, 301). Абодва яны запрэжаны працаваць ад раніцы да ночы, гэтая руціна была паўсядзённай, безвыходнай. Кожны з іх мог толькі марыць хоць аб хвіліначчы адпачынку: «*Гэтак яны ўдвух поўзалі па гэтай камяніцы, аж пакуль не прыгнуўся сашнік, скрыгануўшы аб падземны камень, і не адпарваўся пастронак. Конь, відаць, даўно прывык да гэтай радасці: ён адразу спрытна, не па гадах і сіле сваёй, падаўся назад, але раптам зноў звяў... Адна нага папстрыквала ў калене , сама па сабе, як на спружыне, пакуль ён не аддыхаўся*» (4, 301—302).

Усё жыццё Леапольда складалася з будзённых тыдняў, месяцаў, гадоў пастаяннай працы на зямлі. Працаваў ён дзеля таго, каб далей было лепш. У рамане ёсць наступны момант. Пасля доўгіх перашкод урэшце яго сям'ю напаткалі добрыя змены: камяніца, гліністы кавалак поля, які ён сам апрацоўваў, была ўроблена, у хаце з'явілася мэбля, смутак аб сыну Адасю ўтаймаваўся думкамі аб шчасці дачкі... Але Леапольд Гушка пачаў адчуваць, што яго шчасце ўяўнае. І гэтая трывожнасць асабліва пачала ўзрастаць, калі раптам сканаў яго конь. У гаспадарцы Гушкі гэта быў першы конь. І ён «*цешыўся, што мае свайго каня, ён дагледаў яго лепш як сябе, клапаціўся пра яго больш, чым пра сваю хату і сям'ю*» (4, 328). Ён ужо спадзяваўся, што, адпрацаваўшы купленую зямлю, зажыве шчасліва. Але ў самы шчаслівы дзень Гушкі (дзень вяселля яго дачкі) «немагушчая жывёліна» адмовіла гаспадару ў працы і, прыплёўшыся ў перадсмяротнай агоніі з хвойніку, сканала перад ганкам. Разам са стратай каня гаспадар аддаляецца ад мары зажыць па-чалавечы на ўласным кавалку зямлі. Гэта апісанне пададзена мімаходам, тым не менш з'яўляецца сімвалічным: «...*Раптам Леапольд Гушка штосьці дзіка глянуў у хвойнік: конь, блытаючыся на нагах, несучы шыю ў пярэдніх нагах, туляўся паміж каржакаватых хвояў, беручыся дадому. Да хлява ён не дайшоў, а перад ганкам кінуўся і ўжо больш не падняўся...*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*— Што ж ты не захацеўканаць не дома, — жорстка сказаў Леапольд Гушка... Пальцы рук яго сціснуліся, скурчыліся; ён шугануў да воза, роўны, высокі. Здаецца, камлюватасць у плячах яго раптам прапала»* (2, 338—339). Апошні радок тут вельмі псіхалагічна выразны. Гэтае апісанне смерці каня з'ўляецца сімвалічнай матывіроўкай будучага краху.

Сімвалічны вобраз каня-пакутніка пададзены ў варыянце п'есы «Бацькаўшчына» 1939 года. Стары салдат расказвае наступную гісторыю. У гаспадара быў конь, худы і хворы, які *«за сваё жыццё так з'ездзіўся і спрацаваўся, што ледзьве ногі валачыў»*. Гаспадару хацелася, каб конь аддаваў яму свае апошнія сілы. *«Конь гэтую работу зрабіў і ўжо гатоў быў здыхаць, а гаспадар захацеў яшчэ новых дзесяць рублёў. Так было некалькі разоў, пакуль каню ўжо ніякі догляд не памагаў»*. Калі чалавек заўважыў, што жывёла пражыве не больш, чым суткі, вырашыў выкарыстаць яе да канца — пагнаў за дзесяць вёрст на справах. *«Я бачыў, — кажа* апавядальнік, *— як гаспадар на кані выехаў у вуліцу. Відно было, як у каня пад скурай ходзяць косці, і ён так стагнаў, што здавалася, гэта чалавек уміраe, хочучы жыць»*. На восьмай вярсце конь упаў, сабакі накінуліся на яшчэ жывую жывёлу і пачалі рваць на кавалкі. *«А цяпер я стаў тым самым канём»*, — закончыў сваю гісторыю салдат (2, 115).

Кузьма Чорны падае тут алегарычны вобраз каня, праводзіць паралель паміж жыццём салдата і каня. Салдат, які доўгі час быў на вайне, адчувае сябе тым жа самым «канём», якім карыстаюцца дзеля сваіх мэт. Нават калі ў чалавека застаюцца апошнія сілы, дамагаюцца, каб ён за фальшывыя словы «абарона бацькаўшчыны» прайшоў «апошнія восем вёрст».

Разам з творамі, дзе конь — адзіны памочнік чалавека (апавяданні «На беразе», «Дзень», «Максімка», «Малюнак» і інш.), ёсць тыя, дзе Кузьма Чорны апісвае механізацыю, з якой прыходзіць у вёску новае жыццё (апавяданні «Жалезны крык», «Малюнак»).

У апавяданні «Жалезны крык» на полі з аднаго боку працуе чалавек на трактары, з другога — *«цягне маленькі плужок дробненькі конік»* (1, 99). Конь здаецца міфічнай істотаю, якая трапіла сюды выпадкова. Усё навокал пачынае падстасоўвацца пад «жалезны крык», які ляціць над зямлёй. Нават чалавек параўноўваецца з машынай: *«Чалавек — сам машына і знае сябе. І калі адна трубка ўсярэдзіне папсуецца — можна яе папрвіць... Зямля жалезным крыкам гаворыць, што ёсць чалавек на ёй!»*(1, 94). З канём атаясамліваецца цяжкое жыццё і знемагальная праца.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Дзядзька Павал з апавядання «Малюнаю» у сне бачыць каня, які схуднеў так, што аж прарэбрыны свіцяцца пад скураю. Разам з канём тут з'яўляецца босая жонка, якая робіць, угнуўшыся ў зямлю, абшарпаныя пастушкі з паабдзіранымі нагамі і г.д. Ад каня герой ужо *«адцураўся»*, бо з'яўляецца калгаснікам (свой твор Кузьма Чорны пісаў у 30-я гады, калі шырокім махам адбываўся працэс калектывізацыі).

Такім чынам, вобраз каня ў творчасці Кузьмы Чорнага — гэта не проста апісанне знешняга выгляду і паводзін прадстаўніка фауны Беларусі, гэта мастацкая алегорыя, праз якую аўтар праводзіць сэнсава значную думку. Гэты вобраз дапамагае больш глыбока і разгорнута выявіць унутраны свет герояў, іх пачуцці і погляды.

---

[1] Эпштейн М. Мир животных и самопознание человека (по мотивам русской поэзии XIX—XX вв.) // Человек — природа — искусство. — Л., 1986. — С. 127.

[2] Чорны К. Зб. тв. у 8 т. — Т. 4. — Мн., 1973. — С. 301. — (Далей у тэксце спасылкі на гэтае выданне з пазначэннем тома і старонкі ў дужках.)